Падтрымай "Вясну" на PATREON

Хроніка палітычнага пераследу 29-30 кастрычніка дапоўнена

30.10.2021 **Тэгі**: пераслед, рэпрэсіі

Праваабарончы цэнтр "Вясна" збірае факты палітычнага пераследу ў Беларусі за 29-30 кастрычніка. Рэпрэсіі супраць беларусаў за іх актыўную грамадзянскую пазіцыю і незадаволенасць дзеяннямі ўлады не спыняюцца: іх па-ранейшаму затрымліваюць, праводзяць ператрусы і ўжываюць іншыя формы ціску на грамадзян.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам:

- ***праз тэлеграм-бот @viasna_bot;***
- ***на гарачую лінію ў тэлеграм @ViasnaSOS, @SOSViasna***

Пераслед 30 кастрычніка



Ірына Слаўнікава. Фота: "Радыё Свабода"

Паведамляецца, што не выходзіць на сувязь прадстаўніца тэлеканала «Белсат» **Ірына Слаўнікава**. Сёння ноччу яна прыляцела ў Мінск з Егіпта, але сваякі яе так і не дачакаліся. З Ірынай быў яе муж **Аляксандр Лойка**, ён таксама не выходзіць на сувязь.

Пазней стала вядома, што яны затрыманыя і змешчаныя на Акрэсціна.У Савецкім РУУС Менску, куды бацька Ірыны прыехаў пісаць заяву аб знікненні дачкі, яму паведамілі, што Ірына і Аляксандр затрыманыя за нібыта здзяйсненне нейкага адміністратыўнага правапарушэння. Іх затрымлівалі міліцыянты Першамайскага РУУС.

Навіны палітвязняў

Палітзняволенага журналіста Дзяніса Івашына абвінавачваюць у здрадзе дзяржаве. Яму пагражае да 15 гадоў зняволення

Раней **Дзяніс Івашын** праходзіў падазраваным па арт. 365 КК (умяшанне ў дзейнасць супрацоўніка органаў унутраных спраў). Мяркуючы па адказе жонцы Дзяніса **Вользе**, цяпер ён абвінавачаны і па ч. 1 арт. 356 КК (здрада дзяржаве).

Цяпер палітвязень знаходзіцца ў карцары гродненскай турмы.

На волю з наваполацкай калоніі выйшаў палітвязень Дзяніс Кірэшчанка

Дзяніс Кірэшчанка быў затрыманы 8 жніўня мінулага году ў межах справы аб падрыхтоўцы асобаў да ўдзелу ў масавых беспарадках у Навагрудку і Карэлічах (ч. 3 арт. 293 КК). Разам з Дзянісам па справе праходзіў палітвязень **Уладзімір Гарох**.

29 снежня ў судзе Навагрудскага раёна быў агучаны прысуд: Дзянісу Кірэшчанку прысудзілі **1,5 гады калоніі** агульнага рэжыму, Уладзіміру Гароху – 7 гадоў узмоцненага.

Палітвязень адбываў пакаранне ў наваполацкай калоніі №1. Сёння ён выйшаў на волю, бо **адбыў пакаранне цалкам.**

Палітзняволены Антон Бяленскі адбыў пакаранне. Цяпер ён на волі

30-гадовы **Антон Бяленскі** — індывідуальны прадпрымальнік, валанцёр штаба Віктара Бабарыкі, валанцёр ініцыятывы «Сумленныя людзі». Яго затрымалі 10 жніўня 2020 года ў гасцініцы «Беларусь» на 17-м паверсе — сілавікі ўварваліся ў нумар. За ўдзел у акцыі пратэсту ў дзень выбараў Антону выставілі абвінавачванне па ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса, але перад судом справу пераквалiфікавалі на ч. 1 арт. 342 КК.

5 сакавіка яго асудзілі да **1,5 гады «хіміі»**, якія ён адбыў у выпраўленчай ўстанове адкрытага тыпу №24 у Гродне. Да суда яго ўтрымлівалі пад вартай **амаль сем месяцаў**.

У Беларусі цяпер 831 палітзняволены.

Палітзняволенага салігарчаніна Руслана Акостку змясцілі ў ПКТ у "Віцьбе"



Як стала вядома "Вясне", **Руслана Акостку,** які адбывае пакаранне ў тры гады пазабўлення волі ў "Віцьбе", змясцілі ў ПКТ. Прычына пакарання невядомая. стаў вядомым пасля таго, як 15 лістапада здолеў прайсці амаль праз увесь горад з бел-чырвона-белым сцягам. Такім чынам ён адзначыў акцыю

ў памяць пра забітага **Рамана Бандарэнку.**

Палітвязень Ігар Банцар, якому прысудзілі 1 месяц і 25 дзён калоніі за парушэнне турэмных правілаў, ізноў на «хіміі»



Музыку Ігара Банцара ў сакавіку 2021 года асудзілі на 1,5 года «хіміі», за акцыю пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў – танец у стрынгах перад міліцыянтам.

29 верасня суддзя **Дзяніс Аляксеенка** пастанавіў накіраваць палітвязня ў калонію за нібы **шасцікротнае парушэнне** рэжыму папраўчай установы. За гэта яму прысудзілі 1 месяц і 25 дзён.

Але сёння палітвязня даставілі ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу № 9 у Віцебску.

Прычына вяртання на хімію — абскарджанне адвакаткай Банцэра рашэння суда аб замене пакарання на больш жорсткае. Парушэнні парадку, якія нібыта здзейсніў Банцар, былі зафіксаваныя да ўвядзення новага заканадаўства. Паводле яго Ігара не павінны былі судзіць па артыкуле «замена пакарання на больш жорсткае». Але чамусьці судзілі. Адвакатка заўважыла гэтую нестыкоўку і падала скаргу. Пракурор быў вымушаны апратэставаць рашэнне суду.

Судовае слуханне па справе Мікалая Дзядка прызначана на 3 лістапада ў 10:00

Мікалая абвінавачваюць у закліку да захопу ўлады, незаконных дзеянні з гаручымі рэчывамі, арганізацыі і падрыхтоўкі дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак.

Пераслед 29 кастрычніка ў Беларусі

У Докшыцах 29 кастрычніка супрацоўнікі міліцыі правялі ператрус у Алены Падбярэзскай.

Супраць жанчыны распачалі крымінальную справу нібыта за лайк у «Аднакласніках» па «справе Зэльцара». Пасля допыту яе адпусцілі. Статус жанчыны пакуль невядомы.

Раней Падбярэзскую затрымлівалі на пікете памяці Бандарэнкі — пасля гэтага яна атрымала адміністрацыйны арышт.

У Мінску затрыманы **Дзмітрый Петух**, а ў Магілёве — **Аляксандр Федзьковіч**.

Telegram-канал **«Еўрарадыё»** прызнаны экстрэмісцкім.

У Маскве затрымалі беларуса: ён быў у вышуку за ўдзел у маршы ў Гомелі, на якім «падышоў да супрацоўніка АМАП бліжэй, чым трэба»

29 кастрычніка раніцай у маскоўскім метро паліцыя затрымала жыхара Гомеля **Міхаіла Зубкова**. Яго спынілі для праверкі пашпарта, і высветлілася, што беларус - у вышуку. Цяпер Міхаіл у аддзяленні паліцыі, паведамілі @navinyonline яго сваякі.

У верасні мінулага года Зубкоў удзельнічаў у маршы ў Гомелі, яго затрымаў АМАП. Мужчына правёў 15 сутак у ІЧУ. Больш да яго прэтэнзій з боку міліцыі не было, упэўніваюць сваякі. Міхась з'ехаў на працу ў Маскву.

> *«У жніўні да жонкі і маці Міхаіла прыйшла міліцыя — былі ператрусы, шукалі і яго самога. Потым жонку выклікалі ў СК. Следчая паказала ёй фотаздымкі з маршу і патлумачыла, што яе муж падышоў да супрацоўніка АМАП "бліжэй, чым трэба", і што ў Міхаіла на фота быў чырвоны твар. Гэта значыць "ён гатовы быў кінуцца на супрацоўніка АМАП"»*, — распавялі сваякі.

Папярэдне, на Зубкова распачалі крымінальную справу за гвалт над супрацоўнікам міліцыі.

Пасля 30 сутак арышту на волю не выйшаў слесар заводу «Палімір» Дзмітрый Саюнаў

Дзмітрый павінен быў выйсці на волю 28 кастрычніка, але раніцай таго ж дня на яго быў складзены новы пратакол па **ч.3 арт.24.23 КаАП** (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў), і ўжо ўвечары яму зноў прысудзілі 30 сутак арышту, піша @naftanStachka.

МУС прызнаў сетку тэлеграм-каналаў «NEXTA», «NEXTA-Live» і «Luxta» **экстрэмісцкім фарміраваннем**.

На супрацоўніка "Белтэлекама" з Магілёва Дзмітрыя Каханоўскага завялі крымінальную справу. Сілавікі лічаць, што ён зліваў іх дадзеныя ў тэлеграм-каналы, прызнаныя экстрэмісцкімі.

Як стала вядома MAYDAY, **Дзмітрый Каханоўскі** працаваў у Магілёўскім філіяле «Белтэлекама» інжынерам-сістэматэхнікам, і, як сцвярджаюць супрацоўнікі 11-га ўпраўлення ГУБАЗіК МУС РБ, меў доступ да баз дадзеных аператара. У прыватнасці, нібыта "здабываў з базы асабістыя дадзеныя сілавікоў, дзяржслужачых, суддзяў". Следства сцвярджае, што ўсяго было 46 падобных эпізодаў.


Затрымалі Змітра на працоўным месцы 28 кастрычніка.


Магілёўскага інжынера Дзмітрыя Каханоўскага з Акрэсціна пераводзяць у СІЗА на Валадарскага. Падчас затрымання яму паведамілі, што яго забіраюць у межах ч.3 арт. 130 КК (дзеянні, накіраваныя на распальванне сацыяльнай варожасці, учыненыя групай асобаў).


Інфармацыя дапаўняецца.

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

